У.А.Залатухін,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

# ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА БУДУЧЫХ РЭЖЫСЁРАЎ І АРГАНІЗАТАРАЎ ТЭАТРАЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ

На кафедры тэатральнай творчасці практычнай дзейнасці студэнтаў надаюць важнае значэнне. Практыка — абавязковы элемент навучальнага працэсу, падчас яе студэнты маюць магчымасць рэалізаваць веды, якія набылі на аўдыторных занятках. Ад добра арганізаванай і напоўненай канкрэтным зместам вытворчай практыкі ў многім залежыць якасць падрыхтоўкі будучага спецыяліста.

Рэжысёр, арганізатар тэатральнай творчасці, выкладчык тэатральных дысцыплін па спецыяльнасці "народная творчасць" са спецыялізацыяй "тэатральная творчасць" прызначаны для работы ў тэатральных калектывах, драматычных гуртках, студыях і грамадскіх культурна-асветніцкіх установах, цэнтрах, сацыяльна-культурных арганізацыях, дзяржаўных і прыватных сярэдніх спецыяльных і пачатковых навучальных установах мастацтваў, сярэдніх школах з мастацкім ухілам.

Аб'ектам яго прафесійнай дзейнасці з'яўляецца далучэнне шырокіх слаёў насельніцтва да тэатральнага мастацтва праз: стварэнне драматычных гурткоў, калектываў і студый, аматарскіх і народных тэатраў; арганізацыю клубаў аматараў тэатральнай творчасці; выкладанне тэатральных дысцыплін у навучальных установах.

Будучы спецыяліст павінен выхоўваць і навучаць рэжысёрскім і акцёрскім навыкам, прафесійным якасцям, іншым тэатральным накірункам (сцэнічная мова, пластыка, грым, музыка ў спектаклі), садзейнічаць ранняму выяўленню і развіццю мастацка-творчых здольнасцей дзяцей, праводзіць прафарыентацыйную работу з моладдзю ў

выяўленні іх творчых здольнасцей і інтарэсаў у адпаведнасці з Законам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Набліжэнне да рэалізацыі гэтай мэты немагчымае без набыцця практычнага вопыту, валодання пэўнымі прафесійнымі звычкамі. Будучы спецыяліст павінен валодаць асновамі агульнанавучальных дысцыплін у аб'ёме, які дазваляе на сучасным узроўні вырашаць метадалагічныя і прыкладныя пытанні сацыяльна-выхаваўчага характару, валодаць асновамі этыкі, эстэтыкі і тэорыі культуры тэатра, быць дасведчаным у галіне айчыннай і сусветнай літаратуры, валодаць асновамі агульнай, узроставай і педагагічнай псіхалогіі, гісторыі педагогікі, асноўнымі айчыннымі і замежнымі педагагічнымі ведамі, прынцыпамі і методыкай тэатральнай педагогікі, а таксама асновамі сучаснай эканомікі і права, сацыялогіі і культуры мастацтва, умець выкарыстоўваць на працы метады сацыялагічных і сацыяльна-псіхалагічных даследаванняў.

У мэтах павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з вучэбным планам кафедрай тэатральнай творчасці прадугледжана скразная праграма практыкі студэнтаў з адрывам ад аўдыторных заняткаў, якая праводзіцца ў наступныя тэрміны: чацвёрты семестр — тры тыдні, шосты семестр — чатыры тыдні; восьмы семестр — чатыры тыдні, дзесяты семестр — семнаццаць тыдняў.

На кожны перыяд практыкі павінен быць падрабязны план, які абмяркоўваецца і зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры. Перад пачаткам усіх відаў практыкі рашэннем кафедры зацвярджаюцца рабочыя планы, вызначаюцца кіраўнікі з ліку выкладчыцкага складу кафедры. Па ўзгадненні з органамі культуры і народнай адукацыі кафедра вызначае пералік устаноў для праходжання практыкі. Арганізацыя правядзення скразной практыкі студэнтаў і кантроль за ёй ажыццяўляюцца кафедрай тэатральнай творчасці па планах, якія зацвярджаюцца дэканатам.

На другім курсе, згодна з вучэбным планам, практыка ажыццяўляецца на працягу трох тыдняў з адрывам ад аў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыторных заняткаў і праводзіцца ў чацвёртым семестры.

Мэтай і асноўнымі задачамі практыкі з'яўляюцца: азнаямленне з дзейнасцю творчых калектываў, развіцце ў студэнтаў першапачатковага аналізу арганізацыі працэсу пастаноўкі спектакля, паглыблення прафесійнай арыентацыі, набыццё навыкаў кіраўніка тэатральнага калектыву.

Задачай практыкі студэнтаў трэцяга курса з'яўляецца асваенне вопыту работы вядучых самадзейных і прафесійных калектываў, замацаванне навыкаў рэжысёрскага аналізу п'есы на прыкладах канкрэтных вытворчых умоў. Мэта вытворчай практыкі на трэцім курсе — навучыць студэнта самастойна выкарыстоўваць у практычнай дзейнасці сістэму ведаў, набытых у ходзе навучальнага працэсу. Дзеля гэтага ён прымае ўдзел у пастаноўцы спектакля, навучальным працэсе школы, студыі і інш.

Студэнты чацвёртага курса праходзяць вытворчую пераддыпломную практыку ў тэатрах, аматарскіх аб'яднаннях, школах, ліцэях, цэнтрах эстэтычнага выхавання, дзіцячых, пазашкольных і іншых установах сацыякультурнага напрамку. Вытворчая практыка студэнтаў з'яўляецца важным звяном сістэмы падрыхтоўкі маладога спецыяліста да практычнай дзейнасці. Яна ажыццяўляецца ў адрыве ад вучэбных заняткаў у вызначаных кафедрай базах практыкі і ў адпаведнасці з планам навучання.

Заданне дыпломнай практыкі на пятым курсе ўключае ў сябе самастойную пастаноўку спектакля, драматычнага твора малой формы, тэатралізаванага канцэрта, вечарыны, ранішніка, масавага свята або тэатральную пастаноўку нетрадыцыйнай формы.

Сённяшні час настойліва патрабуе дадатковыя неардынарныя метады і сродкі інтэнсіфікацыі навучання, набыцця прафесійнага вопыту. У сувязі з гэтым на кафедры тэатральнай творчасці за апошнія гады пашырана практычная прафесійная дзейнасць студэнтаў у час адпачынку.

Напрыклад, у час летніх канікулаў студэнтамі кафедры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатральнай творчасці арганізаваны паездкі па забруджаных раёнах чарнобыльскай зоны.

У час навучання пры садзейнічанні выкладчыкаў ажыццяўляецца шэфская работа ў школах, прафесійна-тэхнічных вучылішчах, вышэйшых навучальных установах і інш.

У асобных выпадках студэнты, якія паспяхова вучацца, з дазволу дэканата працуюць у арганізацыйных камітэтах фестываляў, камерцыйных драматычнах тэатрах, канцэртна-забаўляльных праграмах, у здымачных групах (бяруць удзел у кіназдымках), у рабоце іншых творчых калектываў.

Праграма практыкі рэалізуецца з улікам задач і планаў дзейнасці установы, дзе арганізавана практыка. Студэнты падпарадкоўваюцца рэжыму работы ўстановы, якая з'яўляецца базай практыкі, выконваюць распараджэнні яе адміністрацыі.

У выніку вытворчай практыкі студэнт павінен умець:

— аналізаваць стан і культурны ўзровень розных катэгорый насельніцтва, іх запыты і інтарэсы;

— садзейнічаць захаванню і развіццю тэатральнай культуры;

— аказваць практычную дапамогу ў забеспячэнні і арганізацыі эстэтычнага і мастацка-творчага выхавання дзяцей і моладзі;

— ствараць мастацкія праграмы, спектаклі і іншыя тэатралізаваныя формы;

— абагульняць і творча выкарыстоўваць перадавы вопыт выхавання асобы;

— ажыццяўляць дыягностыку розных сацыяльных груп і даваць рэкамендацыі для паступлення ў аматарскія тэатральныя аб'яднанні, клубы, гурткі.

Заданні выконваюцца кожным студэнтам і фіксуюцца ў індывідуальным дзённіку. Па выніках практыкі студэнт атрымлівае адзнаку. Выкананне плана праходжання ўсіх відаў практыкі адлюстроўваецца ў пісьмовых справаздачах, абмяркоўваецца на пасяджэнні кафедры і накіроўваецца ў дэканат і вучэбны аддзел.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ